Прыняты канферэнцыяй
Беларускага дзіцячага фонду
24 верасня 1991 года

Зарэгістраваны
Міністэрствам Юстыцыі
Рэспублікі Беларусь
6 снежня 1991 года
Пасведчанне № 94

Зацверджаны ў новай рэдакцыі
Канферэнцыяй Беларускага
дзіцячага фонду
17 лютага 1995 года

Перарэгістраваны
Міністэрствам юстыцыі
Рэспублікі Беларусь
6 красавіка 1995 года
Пасведчанне № 0180

Змяненні і дапаўненні Статута
зацверджаны Канферэнцыяй
Беларускага дзіцячага фонду
29 лістапада 1996 года

Змяненні і дапаўненні Статута
зарэгістраваны
Міністэрствам юстыцыі
Рэспублікі Беларусь
24 красавіка 1997 года

Змяненні і дапаўненні ў Статут
(ў яго новай рэдакцыі) зацверджаны
Канферэнцыяй Беларускага
дзіцячага фонду
19 мая 1999 года

Перарэгістраваны
Міністэрствам юстыцыі
Рэспублікі Беларусь
29 чэрвеня 1999 года
Пасведчанне № 00149

Змяненні і дапаўненні ў Статут
(у яго новай рэдакцыі)
зацверджаны Канферэнцыяй
РГА "Беларускі дзіцячы фонд"
22 лістапада 2001 года

Змяненні і дапаўненні ў
Статут (у яго новай
рэдакцыі) зарэгістраваны
Міністэрствам юстыцыі
Рэспублікі Беларусь
14 студзеня 2002 года

Змяненні ў Статут (у яго новай
рэдакцыі прыняты Пленумам
РГА "Беларускі дзіцячы фонд"
18 ліпеня 2003 года

Змяненні Статута (у яго
новай рэдакцыі) зарэгістраваны
Міністэрствам юстыцыі
Рэспублікі Беларусь
«25» жніўня 2003 года

Змяненні ў Статут
прыняты Пленумам
РГА "Беларускі дзіцячы фонд"
22 лістапада 2005 года

Змяненні ў Статут
зарэгістраваны
Міністэрствам Юстыцыі
Рэспублікі Беларусь
«26» снежня 2005 года

Змяненні і дапаўненні ў
Статут (ў яго новай рэдакцыі)
Прыняты Пленумам
РГА "Беларускі дзіцячы фонд"
15 жніўня 2006 года

Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь
ДЗЯРЖАЎНАЯ РЭГІСТРАЦЫЯ
здзейснена
Рашэннем ад 15.09.2006 № 313
У Адзіным дзяржаўным рэгістры
юрыдычных асоб і індывідуальных
прадпрымальнікаў № 100184002
Пасведчанне аб рэгістрацыі № 01568
Подпіс
М.П.

# СТАТУТ
## РЭСПУБЛІКАНСКАГА ГРАМАДСКАГА АБ'ЯДНАННЯ "БЕЛАРУСКІ ДЗІЦЯЧЫ ФОНД"

Мінск
2006

## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1.1. Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне "Беларускі дзіцячы фонд" (далей па тэксту РГА "Беларускі дзіцячы фонд") з'яўляецца рэспубліканскай, масавай няўрадавай, дабрачыннай арганізацыяй, дзейнасць якой скіравана на дапамогу дзецям, якая кіруецца ў сваей рабоце дзеючай Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, Законамі Рэспублікі Беларусь "Аб грамадскіх аб'яднаннях" і "Аб правах дзіцяці", іншым дзеючым заканадаўствам і дадзеным Статутам.

РГА "Беларускі дзіцячы фонд" з'яўляецца правапераймальнікам Беларускага аддзялення Савецкага дзіцячага фонду імя У.І.Леніна (1988-1991).

Поўная назва РГА "Беларускі дзіцячы фонд" на рускай мове – Республиканское общественное объединение "Белорусский детский фонд", скарочаная - РОО "Белорусский детский фонд" ці РОО «БДФ».

Поўная назва на беларускай мове - Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне "Беларускі дзіцячы фонд", скарочаная - РГА "Беларускі дзіцячы фонд" ці РГА "БДФ".

1.2. РГА "Беларускі дзіцячы фонд" з'яўляецца юрыдычнай асобай, а яго арганізацыйныя структуры могуць надзяляцца правам юрыдычнай асобы по рашэнню Праўлення РГА "Беларускі дзіцячы фонд".

1.3. РГА "Беларускі дзіцячы фонд" мае пячатку, штамп, эмблему, разліковыя рахункі ва ўстановах банкаў, абасобленую маёмасць, самастойны баланс, можа мець сцяг, гімн і іншую сімволіку, зарэгістраваную ва ўстаноўленым парадку.

1.4. РГА "Беларускі дзіцячы фонд" ажыццяўляе сваю дзейнасць ва ўзаемадзеянні з дзяржаўнымі органамі ўлады і кіравання і іншымі грамадскімі аб'яднаннямі.

РГА "Беларускі дзіцячы фонд" можа выступаць заснавальнікам і ўдзельнічаць у дзейнасці іншых рэспубліканскіх, міжнародных грамадскіх аб'яднанняў і арганізацый, дзейнасць якіх скіравана на абарону правоў дзяцей, уступаць у якасці раўнапраўнага партнера ў міжнародныя грамадскія аб'яднанні, фонды, асацыяцыі і т.п., падтрымліваць з імі прамыя міжнародныя кантакты і сувязі, заключаць адпаведныя пагадненні. Узаемаадносіны з імі ажыццяўляюцца на аснове дагавора аб супрацоўніцтве.

РГА "Беларускі дзіцячы фонд" ажыццяўляе сваю дзейнасць на тэрыторыі Беларусі, але можа мець свае прадстаўніцтвы і ў іншых дзяржавах.

1.5. РГА "Беларускі дзіцячы фонд", яго мясцовыя арганізацыі могуць:

- у адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам ажыццяўляць гаспадарчую і іншую дзейнасць, ствараць прадпрыемствы і іншыя гасразліковыя арганізацыі з мэтай прыцягнення сродкаў дзеля выканання статутных задач;

- праводзіць выстаўкі-продажы твораў літаратуры, мастацтва і іншых вырабаў, дабрачынныя канцэрты, ажыццяўляць іншыя, не забароненыя заканадаўствам мерапрыемствы;

- ажыццяўляць за кошт уласных сродкаў будаўніцтва аб'ектаў вытворчага, сацыяльнага прызначэння;

- атрымліваць грашовыя сродкі, маемасць, гуманітарную дапамогу ад айчынных і замежных спонсараў, займацца дзіцячым

аздараўленнем і турызмам, у тым ліку - замежным ва ўстаноўленным заканадаўствам парадку;

- РГА "Беларускі дзіцячы фонд" нясе адказнасць па ўзятых на сябе абявязках усёй наяўнай маёмасцю. РГА "Беларускі дзіцячы фонд" не нясе адказнасць па абавязках сваіх членаў і аддзяленняў. Члены і аддзяленні РГА "Беларускі дзіцячы фонд" не адказваюць па абавязках РГА "Беларускі дзіцячы фонд".

1.6. Юрыдычны адрас РГА "Беларускі дзіцячы фонд": 220005, Рэспубліка Беларусь, г.Мінск, праспект Незалежнасці - 31.

## 2.МЭТЫ, ЗАДАЧЫ, ПРАДМЕТ І МЕТАДЫ ДЗЕЙНАСЦІ

2.1. Галоўнай мэтай РГА "Беларускі дзіцячы фонд" з'яўляецца абарона правоў і інтарэсаў дзяцей, аказанне ім матэрыяльнай, маральнай і іншай дапамогі і падтрымкі, і ў першую чаргу - дзецям-сіротам, дзецям, якія знаходзяцца пад апекай, пацярпеўшым ад аварыі на Чарнобыльскай атамнай станцыі, з шматдзетных і няпоўных сямей, хворым і дзецям-інвалідам.

2.2. Для рэалізацыі сваей мэты РГА "Беларускі дзіцячы фонд" выконвае задачы:

- аб'ядноўвае грамадзян і арганізацыі, працоўныя калектывы для выканання праграм, накіраваных на дапамогу хворым дзецям, сіротам, інвалідам, на ўдасканальванне ўсіх аспектаў іх выхавання і развіцця. Аказвае асаблівую ўвагу дзецям, пацярпеўшым ад аварыі на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі;

- садзейнічае распрацоўцы і ажыццяўленню агульнарэспубліканскіх, рэгіянальных і мясцовых праграм,

скіраваных на праблемы дзяцей. У экстрэмальных выпадках дапамагае дзецям, якія не з'яўляюцца грамадзянамі Рэспублікі Беларусь;

- разам з дзяржаўнымі і грамадскімі арганізацыямі РГА "Беларускі дзіцячы фонд" дамагаецца ўмацавання аўтарытэту і ролі сям'і, арганізоўвае грамадскую апеку над дамамі дзіцяці, дзіцячымі дамамі, школамі-інтэрнатамі, дзіцячымі дамамі сямейнага тыпу, аказвае дапамогу дзіцячым бальніцам і санаторыям, сем'ям, якія ўзялі пад апеку дзяцей-сірот, сямейным дзіцячым дамам, садзейнічае вучобе і працаўладкаванню выпускнікоў школ-інтэрнатаў, аказвае ім неабходную дапамогу;

- выяўляе, вывучае і прапагандуе карысныя ініцыятывы, накіраваныя на паляпшэнне ўмоў развіцця дзяцей, станоўчы вопыт адпачынку дзяцей, забяспечвае гэтым ініцыятывам і вопыту матэрыяльную, маральную і арганізацыйную падтрымку;

- выяўляе таленавітых, здольных дзяцей, дапамагае ствараць неабходныя ўмовы для развіцця іх таленту, устанаўлівае спецыяльныя стыпендыі;

- развівае рознабаковае міжнароднае супрацоўніцтва ў галіне вывучэння і рашэння праблем дзяцінства, супрацоўнічае з гэтай мэтаю з Дзіцячым фондам ААН (ЮНІСЭФ), іншымі міжнароднымі арганізацыямі;

- забяспечвае шырокую галоснасць дзейнасці праз свае выданні, а таксама ў рэспубліканскай перыедыцы, на радые і тэлебачанні.

2.3. Прадметам дзейнасці РГА "Беларускі дзіцячы фонд" з'яўляецца ажыццяўленне сумесна с дзяржаўнымі ўстановамі і

арганізацыямі, грамадскімі арганізацыямі і бізнасструктурамі дабрачынных праграмм і акцый, напраўленных на дапамогу і падтрымку дзяцей, сям'і, іншіх сацыяльна-неабароненных слаёў насельніцтва, дапамогу школам і пазашкольным установам, дзіцячым дамам, школам-інтэрнатам, дзіцячым дамам сямейнага тыпу, бальніцам і санаторыям, іншым установам, у якіх жывуць, вучацца, лечацца ці адпачываюць дзеці.

2.4. РГА "Беларускі дзіцячы фонд" арганізуе сваю дзейнасць гуманнымі, дэмакратычнымі метадамі на прынцыпах галоснасці, калегіяльнасці ва ўзаемаадносінах з дзяржаўнымі органамі ўлады, грамадскімі аб'яднаннямі і рухамі, асобнымі грамадзянамі.

2.5. За асобыя заслугі перад РГА "Беларускі дзіцячы фонд" і гуманістычную дзейнасць па абароне дзяцінства Прэзідыум РГА "Беларускі дзіцячы фонд" можа ўзнагароджваць грамадзян Рэспублікі Беларусь і іншых краін, арганізацыі прэміяй "Друг дзяцей", Ганаровай граматай і іншымі ўзнагародамі РГА "Беларускі дзіцячы фонд".

2.6. Віды дзейнасці, на якія патрабуецца ліцэнзія, магчымы толькі пасля атрымання на іх дазволу ў адпаведных органах.

## 3.ЧЛЕНСТВА РГА "БЕЛАРУСКІ ДЗІЦЯЧЫ ФОНД", ПРАВЫ І АБАВЯЗКІ ЧЛЕНАУ

3.1. РГА "Беларускі дзіцячы фонд" - масавая грамадская арганізацыя, якая мае фіксаванае членства. Яго членамі могуць быць грамадзяне Рэспублікі Беларусь, іншых рэспублік і краін, асобы без грамадзянства, пастаянна пражываючыя на тэрыторыі Рэспублікі

Беларусь, якія дасягнулі ўзросту 16 гадоў, прымаюць Статут РГА "Беларускі дзіцячы фонд", аказваюць добраахвотную матэрыяльную, арганізацыйную і іншую дапамогу РГА "Беларускі дзіцячы фонд" у рэалізацыі яго праграм і задач.

3.2. Прыём у члены РГА "Беларускі дзіцячы фонд" праводзіцца на пасяджаннях Прэзідыумаў РГА "Беларускі дзіцячы фонд", яго абласных, гарадскіх і раённых аддзяленняў на падставе асабістай заявы ўступаючага.

Улік членаў РГА "Беларускі дзіцячы фонд" праводзіцца шляхам запісу ў журналах уліку.

3.3. Член РГА "Беларускі дзіцячы фонд" мае права:

- удзельнічаць ва ўсіх мерапрыемствах і акцыях РГА "Беларускі дзіцячы фонд" і яго аддзяленняў;

- прапаноўваць, выбіраць і быць абраным у выбарчыя органы РГА "Беларускі дзіцячы фонд" і яго аддзяленняў (Дырэктарам, Старшыней, членам Праўлення ці Рэвізійнай камісіі - па дасягненні 18 гадоў);

- самастойна ці з удзелам зацікаўленых грамадскіх арганізацый са згоды сям'і праводзіць абследванне ўмоў жыцця дзяцей, забеспячэння іх правоў на адукацыю, выхаванне, выбар прафесіі, медыцынскае абслугоўванне, прымаць меры па ліквідацыі выяўленых недахопаў;

- уносіць у кіруючыя органы РГА "Беларускі дзіцячы фонд" і яго аддзяленні, органы дзяржаўнай улады і кіравання прапановы, скіраваныя на ажыццяўленне мэт і задач РГА "Беларускі дзіцячы фонд", удзельнічаць у іх рэалізацыі;

- аказваць матэрыяльнае, арганізацыйнае ці іншае, адпавядаючае законам, магчымае садзейнічанне РГА "Беларускі дзіцячы фонд" і яго аддзяленням;

- атрымліваць грашовае ці іншае ўзнагароджанне за выкананне пэўных работ, кампенсацыю панесенных затрат, звязанных са статутнай дзейнасцю;

- свабодна выйці з членаў РГА "Беларускі дзіцячы фонд";

- мець іншыя правы, звязаныя са статутнай дзейнасцю.

3.4. Член РГА "Беларускі дзіцячы фонд" абавязаны:

- выконваць данны Статут;

- абараняць інтарэсы дзяцей, змагацца супраць дзеянняў, якія наносяць урон дзяцінству, аказваць аднаразовую ці сістэматычную матэрыяльную дапамогу, арганізацыйнае ці іншае неабходнае садзейнічанне РГА "Беларускі дзіцячы фонд";

- удзельнічаць у рэалізацыі праграм РГА "Беларускі дзіцячы фонд", прапагандаваць дзейнасць РГА "Беларускі дзіцячы фонд".

3.5. Актывісты РГА "Беларускі дзіцячы фонд", грамадзяне і арганізацыі, якія аказваюць матэрыяльную, арганізацыйную ці іншую дапамогу РГА "Беларускі дзіцячы фонд", могуць атрымліваць адпаведны дакумент, які падцвярждае іх дабрачынную дапамогу РГА "Беларускі дзіцячы фонд".

3.6. Членства ў РГА "Беларускі дзіцячы фонд" губляецца ў выпадках выхаду ці выключэння.

3.7. Член РГА "Беларускі дзіцячы фонд" лічыцца самастойна выйшаўшым са складу членаў арганізацыі з моманту паступлення ад яго пісьмовай заявы.

3.8. Выключэнне з членаў РГА “Беларускі дзіцячы фонд” праводзіцца ў выпадках:

- дзеянняў, не адпавядаючых прынцыпам і Статуту РГА “Беларускі дзіцячы фонд”;

- неабгрунтаванага адказу ад удзелу ў праграмах і акцыях РГА “Беларускі дзіцячы фонд” і яго аддзяленняў;

- адсутнасці сувязі з РГА “Беларускі дзіцячы фонд” і яго аддзяленнямі.

3.9. Рашэнні аб прыёме ці выключэнні з членаў РГА “Беларускі дзіцячы фонд” прымаюцца Прэзідыумамі РГА “Беларускі дзіцячы фонд” і яго аддзяленняў простай большасцю галасоў.

3.10. Выключэнне з членаў РГА “Беларускі дзіцячы фонд” можа быць абскарджана Праўленням РГА “Беларускі дзіцячы фонд” і яго аддзяленняў.

## 4. СТРУКТУРА РГА “БЕЛАРУСКІ ДЗІЦЯЧЫ ФОНД”. КІРУЮЧЫЯ ОРГАНЫ І ІХ ПАЎНАМОЦТВЫ

4.1. РГА “Беларускі дзіцячы фонд” будуецца па тэрытарыяльнаму прынцыпу і складаецца з абласных, гарадскіх і раенных аддзяленняў, якія ажыццяўляюць сваю дзейнасць згодна з данным Статутам.

4.2. Аддзяленні РГА “Беларускі дзіцячы фонд” ствараюцца па рашэнню вышэйстаячага кіруючага органа РГА “Беларускі дзіцячы фонд”:

абласныя - па рашэнню Праўлення РГА “Беларускі дзіцячы фонд” пры наяўнасці 2 і болей гарадскіх ці раённых арганізацый;

гарадскія і раённыя - па рашэнню кіруючага органа абласнога аддзяленя РГА "Беларускі дзіцячы фонд" пры наяўнасці 10 і болей членаў РГА "Беларускі дзіцячы фонд".

4.3. Аддзяленні РГА "Беларускі дзіцячы фонд" ліквідуюцца таксама па рашэнню вышэйстаячага кіруючага органа РГА "Беларускі дзіцячы фонд":

абласныя – па рашэнню Праўлення РГА "Беларускі дзіцячы фонд";

гарадскія і раённыя – па рашэнню Праўлення абласнога аддзялення РГА "Беларускі дзіцячы фонд".

4.4. Аддзяленні маюць тыя ж мэты і задачы, прадмет і метады дзейнасці, што і РГА "Беларускі дзіцячы фонд" і працуюць у адпаведнасці з дадзеным Статутам. Іх вышэйшыя органы самастойна вызначаюць структуру выбарчых органаў.

4.5. Вышэйшым органам РГА "Беларускі дзіцячы фонд", яго абласных, гарадскіх і раённых аддзяленняў з'яўляецца адпаведна рэспубліканская, абласная, гарадская, раённая Канферэнцыя членаў РГА "Беларускі дзіцячы фонд" ці іх дэлегатаў (прадстаўнікоў). Канферэнцыя склікаецца адзін раз у пяць гадоў.

Пазачарговая рэспубліканская Канферэнцыя можа быць склікана па рашэнню Праўлення РГА "Беларускі дзіцячы фонд", яго Рэвізійнай камісіі, ці па патрабаванню большасці абласных аддзяленняў РГА "Беларускі дзіцячы фонд";

- абласная Канферэнцыя – па рашэнню Праўлення РГА "Беларускі дзіцячы фонд", Праўлення абласнога аддзялення РГА "Беларускі дзіцячы фонд", яго рэвізійнай камісіі, ці па патрабаванню большасці раённых, гарадскіх аддзяленняў вобласці;

- гарадская, раённая Канферэнцыя – па рашэнню Праўлення абласнога аддзялення РГА "Беларускі дзіцячы фонд", Праўлення гарадскога, раённага аддзялення, ці па патрабаванню большасці членаў гарадской, раённай арганізацыі.

Нормы прадстаўніцтва, дату правядзення і парадак выбрання дэлегатаў на рэспубліканскую, абласную, гарадскую ці раённую Канферэнцыі вызначаюцца адпаведна Праўленямі РГА "Беларускі дзіцячы фонд", яго абласных, гарадскіх ці раённых арганізацый, на пазачарговыя Канферэнцыі – адпаведнымі Прэзідыумамі РГА "Беларускі дзіцячы фонд" і яго абласных, гарадскіх ці раённых аддзяленняў.

Выключна Канферэнцыя РГА "Беларускі дзіцячы фонд":

- прымае статут РГА "Беларускі дзіцячы фонд", уносіць у яго змяненні і дапаўненні;

- прымае рашэнне аб рэарганізацыі і заканчэнні дзейнасці РГА "Беларускі дзіцячы фонд";

Канферэнцыя РГА "Беларускі дзіцячы фонд", яго абласных, гарадскіх ці раённых арганізацый адпаведна:

- вызначае важнейшыя задачы і асноўныя накірункі дзейнасці РГА "Беларускі дзіцячы фонд" і яго аддзяленняў;

- выбірае большасцю галасоў Праўленне, Рэвізійную камісію;

- заслухоўвае і абмяркоўвае справаздачы Праўлення і Рэвізійнай камісіі;

- разглядае скаргі на рашэнні свайго кіруючага органа;

- разглядвае іншыя пытанні дзейнасці РГА "Беларускі дзіцячы фонд" і яго аддзяленняў;

- Канферэнцыя правамоцна, калі на ёй прысутнічае не меньш палавіны абраных дэлегатаў (прадстаўнікоў) членаў арганізацыі. Рашэнні прымаюцца простай большасцю галасоў ад ліку прысутнічаючых, а па пытаннях аб спыненні дзейнасці фонду - не меньш 2/3 галасоў ад абраных дэлегатаў (прадстаўнікоў).

4.6. Кіруючым органам РГА "Беларускі дзіцячы фонд", яго абласных, гарадскіх і раённых аддзяленняў з'яўляецца адпаведна Праўленне РГА "Беларускі дзіцячы фонд", яго абласных, гарадскіх і раённых аддзяленняў. Праўленне выбіраецца тэрмінам на 5 гадоў у колькасці, якая ўстанаўліваецца Канферэнцыяй.

Выключна Праўленне РГА "Беларускі дзіцячы фонд":

- уносіць змяненні ці дапаўненні ў Статут, звязаныя з пераменай юрыдычнага адрасу (месца знаходжання кіруючага органу) альбо абумоўленыя зменай у заканадаўстве;

- зацвярджае ўзоры пячатак, штампаў, сімволікі і іншай атрыбутыкі;

- прымае рашэнні аб стварэнні абласных аддзеленняў і наданні ім правоў юрыдычнай асобы;

Праўленне РГА "Беларускі дзіцячы фонд", яго абласных, гарадскіх і раённых аддзяленняў адпаведна:

- арганізуе выкананне рашэнняў рэспубліканскай, абласной, гарадской і раённай Канферэнцый;

- кіруе дзейнасцю арганізацыі ў перыяд паміж Канферэнцыямі;

- выбірае са свайго складу простай большасцю галасоў ад ліку прысутнічаючых старшыню Праўлення, Дырэктара і Прэзідыум тэрмінам на 5 гадоў;

- заслухоўвае справаздачы і інфармацыі аб дзейнасці Прэзідыума;

- разглядае скаргі на рашэнні Старшыні Праўлення, Дырэктара, Прэзідыума;

- заслухоўвае інфармацыі аб даходах і расходах, зацвярджае найбольш важныя праграмы і праекты, перспектыўныя сметы расходаў і даходаў;

- прымае рашэнні аб выключэнні са складу Праўлення альбо аб кааптацыі ў склад Праўлення новага члена замест выбыўшага ці выключанага.

Выключанымі са складу членаў Праўлення могуць быць грамадзяне, якія выключаны ці выйшлі з членаў РГА "Беларускі дзіцячы фонд", не прысутнічалі без важкай прычыны на пасяджэннях 2 і болей Пленумаў Праўлення, адмаўляюцца ад выканання рашэнняў Праўлення і яго даручэнняў, падалі заяву аб выхадзе са складу Праўлення ў сувязі з пераменай месца жыхарства, працы ці іншымі аб'ектыўнымі прычынамі;

- частку сваіх паўнамоцтваў можа перадаваць Прэзідыуму;

- разглядае іншыя пытанні дзейнасці.

Праўленне абласнога аддзялення прымае рашэнні аб стварэнні гарадскіх і раённых аддзяленняў.

Пры Праўленні РГА "Беларускі дзіцячы фонд" і яго аддзяленняў з ліку яго членаў і актыву могуць ствараца камісіі і іншыя фарміраванні па асноўных напрамках дзейнасці РГА "Беларускі дзіцячы фонд".

Паседжанні Праўлення альбо Пленумы РГА "Беларускі дзіцячы фонд" і яго аддзяленняў праводзяцца па меры неабходнасці, але не радзей аднаго разу ў год.

Пленум правамоцны, калі на ім прысутнічае больш палавіны членаў Праўлення. Рашэнні прымаюцца адкрытым галасаваннем простай большасцю галасоў ад ліку прысутнічаючых.

Пазачарговы Пленум праводзіцца па рашэнні Прызідыума ці па пісьмоваму патрабаванню не меньш 1/3 членаў Праўлення. У выпадку неадкладнасці разгляду пытанняў, якія адносяцца выключна да кампетэнцыі Праўлення і немагчымасці склікання паседжэння ў неабходны тэрмін, дапускаецца пісьмовае альбо тэлефоннае апытанне членаў Праўлення з абавязковым наступным падцвярджэннем членам Праўлення свайго рашэння.

4.7. Выканаўча-распарадчым органам РГА "Беларускі дзіцячы фонд", яго абласных, гарадскіх і раённых аддзяленняў з'яўляецца адпаведна Прэзідыум РГА "Беларускі дзіцячы фонд", абласных, гарадскіх і раённых аддзяленняў. Пасяджэнні Прэзідыума праводзяцца па меры неабходнасці, але не радзей аднаго разу ў квартал.

Выключна Прэзідыум РГА "Беларускі дзіцячы фонд":

- устанаўлівае размер уступнага і членскага узносаў;

- прымае рашэнні аб стварэнні і ліквідацыі арганізацый і камерцыйных прадпрыемстваў, аб удзеле ў рабоце камерцыйных структур, дзейнасць якіх неабходна для выканання статутных задач, зацвярджае іх Статуты і кіраўнікоў.

Прэзідыум РГА "Беларускі дзіцячы фонд", яго абласных, гарадскіх і раённых аддзяленняў адпаведна:

- накіроўвае і кантралюе дзейнасць мясцовых арганізацый, штатных супрацоўнікаў і валанцёраў, заслухоўвае справаздачы аб іх рабоце;

- разглядае і зацвярджае гадавыя каштарысы расходаў і даходаў, ажыццяўляе кантроль за іх выкананнем, распрацоўвае і зацвярждае праекты і праграмы арганізацыі;

- можа выйсці на паседжанне кіруючых органаў арганізацыі з рэкамендацыямі па кадравых і праграмных пытаннях;

- прымае рашэнні аб узнагароджванні ганаровымі прэміямі і стыпендыямі, Ганаровай граматай фонда ці аддзялення;

- прымае рашэнні аб прыёме і выключэнні з членаў РГА "Беларускі дзіцячы фонд".

- частку сваіх паўнамоцтваў можа перадаваць Дырэктару;

- разглядвае іншыя пытанні дзейнасці РГА "Беларускі дзіцячы фонд" і яго мясцовых арганізацый.

Прэзідыум правамоцны, калі на ім прысутнічае не меньш палавіны яго членаў. Рашэнні прымаюцца адкрытым галасаваннем простай большасцю галасоў з ліку прысутнічаючых.

4.8. Вышэйшыя пасады РГА "Беларускі дзіцячы фонд", яго абласных, гарадскіх і раённых аддзяленняў адпаведна - Старшыня Праўлення, Дырэктар РГА "Беларускі дзіцячы фонд", Старшыня Праўлення, Дырэктар абласнога, гарадскога і раённага аддзялення РГА "Беларускі дзіцячы фонд".

Старшыня Праўлення РГА "Беларускі дзіцячы фонд", яго абласных, гарадскіх ці раённых аддзяленняў:

- выбіраецца на паседжанні Праўлення рэспубліканскага, абласнога, гарадскога ці раённага аддзялення (далей Пленуме) з ліку

членаў Праўлення простай большасць галасоў тэрмінам на 5 гадоў і ў сваей рабоце падсправаздачны Праўленню;

- кіруе паседжаннямі Праўлення;

- прадстаўляе арганізацыю ў органах дзяржаўнай улады і кіравання Рэспублікі Беларусь і іншых краінах;

- выконвае свае абавязкі на грамадскіх пачатках;

- выконвае іншыя функцыі ў рамках сваіх паўнамоцтваў.

Дырэктар РГА "Беларускі дзіцячы фонд", яго абласных, гарадскіх і раённых аддзяленняў адпаведна:

- выбіраецца на Пленуме Праўлення рэспубліканскага, абласных, гарадскіх ці раённых аддзяленняў з ліку членаў Праўлення простай большасцю галасоў тэрмінам на 5 гадоў і ў сваей рабоце падсправаздачны Праўленню;

- валодае ўсімі правамі і паўнамоцтвамі кіраўніка юрыдычнай асобы;

- без даверанасці дзейнічае ад імя РГА "Беларускі дзіцячы фонд", яго абласных, гарадскіх ці раённых аддзяленняў;

- арганізуе рэалізацыю праграм дзейнасці арганізацыі і вырашае пытанні яе планавання, фінансавання, матэрыяльна-тэхнічнага забяспячэння;

- забяспечвае выкананне рашэнняў Праўлення;

- адкрывае банкаўскія рахункі;

- распараджаецца фінансавымі і матэрыяльнымі сродкамі, маёмасцю, уласнасцю РГА "Беларускі дзіцячы фонд";

Сродкамі, маёмасцю і ўласнасцю, якая знаходзіцца на балансе абласнога, гарадскога, раённага аддзялення распараджаецца Дырэктар

абласнога, гарадскога, раённага аддзялення РГА "Беларускі дзіцячы фонд".

- праводзіць розныя зделкі і юрыдычныя акты, заключае дагаворы і пагадненні;

- зацвярджае штатны расклад, размер зарабатнай платы штатных супрацоўнікаў, парадак іх матэрыяльнага заахвочвання і прэміравання (толькі Дырэктар РГА "Беларускі дзіцячы фонд"); прымае і звальняе штатных супрацоўнікаў, кіруе работай апарата;

- прадстаўляе арганізацыю у зносінах з органамі дзяржаўнай улады і кіравання, прадпрыемствамі, грамадскімі арганізацыямі, у тым ліку і замежнымі;

-падпісвае разам з галоўным бухгалтарам фінансавыя дакументы;

- выдае даверанасці;

- разглядае іншыя пытанні ў межах сваей кампетэнцыі.

4.9. Па рашэнню Праўлення абласнога, гарадскога, раённага аддзялення РГА "Беларускі дзіцячы фонд" старшыня абласнога, гарадскога, раённага аддзялення РГА "Беларускі дзіцячы фонд" можа адначасова выконвать функцыі Дырэктара гэтага аддзялення і карыстацца ўсімі яго правамі і паўнамоцтвамі.

4.10. Кантрольным органам РГА "Беларускі дзіцячы фонд", яго абласных, гарадскіх і раённых аддзяленняў з'яўляецца адпаведна рэспубліканская, абласная, гарадская ці раённая Рэвізійная камісія, якая:

- выбіраецца адпаведнай Канферэнцыяй тэрмінам на 5 гадоў. Яе колькасны склад вызначаецца Канферэнцыяй;

- Рэвізійная камісія збіраецца на паседжанні па меры неабходнасці, але не радзей чым два разы за справаздачны перыяд;

- паседжанні Рэвізійнай камісіі правамоцны, калі на іх прысутнічаюць не меньш палавіны яе членаў. Рашэнні прымаюцца адкрытым галасаваннем простай большасцю галасоў з ліку прысутнічаючых;

- кантралюе фінансавую і гаспадарчую дзейнасць арганізацыі, створаных прадпрыемстваў і арганізацый;

- рэвізуе стан і ўлік матэрыяльных каштоўнасцей, правярае тэрмін і правільнасць выканання прынятых рашэнняў Праўлення, Прэзідыума, Старшыні Праўлення і Дырэктара, працу з пісьмамі, прапановамі і заявамі грамадзян;

- старшыня выбіраецца членамі Рэвізійнай каміссіі са свайго складу простай большасцю галасоў;

- члены Рэвізійнай каміссіі не могуць быць выбраны ў іншыя выбарчыя органы, быць кіраўнікамі і галоўнымі спецыялістамі ў створаных прадпрыемствах і арганізацыях.

Яны могуць удзельнічаць у рабоце выбарных органаў з правам дарадчага голаса.

4.11. Усе рашэнні калегіяльных органаў афармляюцца пратаколамі.

4.12. Рашэнні ніжэй стаячых органаў абскарджваюцца ў вышэйстаячыя;

4.13. Дакументы РГА "Беларускі дзіцячы фонд" і яго аддзяленняў ва ўстаноўленым парадку, у адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам, здаюцца ў адпаведныя архівы Рэспублікі Беларусь.

# 5.СРОДКІ, МАЕМАСЦЬ І ФІНАНСАВА-ГАСПАДАРЧАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ

5.1. Сродкі РГА "Беларускі дзіцячы фонд" і яго аддзяленняў фарміруюцца:

- з усіх відаў добраахвотных, уступных і членскіх узносаў, ахвяраванняў і адлічэнняў грамадзян Рэспублікі Беларусь і грамадзян іншых краін, працоўных калектываў, грамадскіх арганізацый, нацыянальных і міжнародных арганізацый;

- паступленняў ад правядзення выставак-продажу, падораных каштоўнасцей і маёмасці, выробленай прадукцыі, выдавецкай і канцэртнай дзейнасці, спартыўных і іншых мерапрыемстваў і акцый;

- адлічэнняў ад прыбытку юрыдычных асоб, створаных па рашэнню РГА "Беларускі дзіцячы фонд";

- з даходаў ад прадпрымальніцкай дзейнасці, ажыцяўляемай у парадку ўстаноўленым артыкулам 20 Закона "Аб грамадскіх аб'яднаннях";

- іншых не забароненых законам паступленняў.

5.2. Усе ахвяраванні РГА "Беларускі дзіцячы фонд" і яго аддзяленням рэгіструюцца ў яго бухгалтэрыі ці бухгалтэрыях мясцовых арганізацый.

5.3. РГА "Беларускі дзіцячы фонд" можа атрымліваць грашовыя сродкі і маёмасць ад сваіх аддзяленняў, арганізацый і прадпрыемстваў, а таксама перадаваць грашовыя сродкі, уласнасць, маёмасць і іншыя каштоўнасці сваім аддзяленням, арганізацыям і прадпрыемствам,

грамадзянам і юрыдычным асобам згодна са Статутам у адпаведнасці з яго мэтамі і задачамі і дзеючым заканадаўствам.

5.4. РГА "Беларускі дзіцячы фонд" можа мець ва ўласнасці любую маёмасць, неабходную для забяспячэння яго дзейнасці, за выключэннем аб'ектаў, якія, у адпаведнасці з Законам, могуць знаходзіцца толькі ў дзяржаўнай уласнасці.

Уласнікам маёмасці РГА "Беларускі дзіцячы фонд", у тым ліку маёмасці, якая знаходзіцца ў аддзяленяў РГА "Беларускі дзіцячы фонд", з'яўляецца РГА "Беларускі дзіцячы фонд".

Сродкі і маёмасць РГА "Беларускі дзіцячы фонд" не могуць пераразмяркоўвацца паміж членамі РГА "Беларускі дзіцячы фонд" і ўжываюцца толькі для выканання статутных мэт і задач.

5.5. РГА "Беларускі дзіцячы фонд" і яго аддзяленні могуць ужываць дабрачынныя паступленні на правядзенне Пленумаў, аплату камандыровак, выданне сваіх газет, часопісаў, значкоў, сувеніраў і іншай прадукцыі, на расходы, звязаныя з сустрэчай спонсараў і партнераў, падтрымку дзейнасці падведамасных прадпрыемстваў і арганізацый, аплату працы, матэрыяльную дапамогу і прэміраванне штатных супрацоунікаў РГА "Беларускі дзіцячы фонд" і яго аддзяленняў, яго актыву і іншыя гаспадарчыя патрэбы і мерапрыемствы.

## 6. ЛІКВІДАЦЫЯ РГА "БЕЛАРУСКІ ДЗІЦЯЧЫ ФОНД"

6.1. РГА "Беларускі дзіцячы фонд" можа быць ліквідавана альбо рэарганізавана па рашэнню Канферэнцыі РГА "Беларускі

дзіцячы фонд", прынятым большасцю ў дзве трэці галасоў абраных дэлегатаў, ці па рашэнню Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь.

6.2. Усе сродкі і маемасць РГА "Беларускі дзіцячы фонд", якія застануцца пасля пагашэння даўгоў, перадаюцца яго праваператймальніку ці накіроўваюцца на мэты, прадугледжаныя дадзеным Статутам.

6.3. РГА "Беларускі дзіцячы фонд" не адказвае па даўгах сваіх членаў гэтак жа як і яны не адказваюць па яго даўгах.

Прашыта і змацавана пячаццю
21 ліст (дваццаць адзін ліст)

Галоўны спецыяліст Упраўлення грамадскіх
аб'яднанняў Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь
Л.І.Калячка